# СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВАЕННАГА ЗАКАНАДАЎСТВА БЕЛАРУСІ: ГІСТАРЫЧНЫ АСПЕКТ

**В. А. Шаршун**

Развіццё прававой сістэмы, прынящце новых нарматыўных прававых актаў, унясенне ў іх змяненняў і дапаўненняў аб'ектыўна абумоўліваюць неабходнасць упарадкавання ўсяго комплексу дзеючых актаў заканадаўства, іх узбуйнення, прывядзення ў вызначаную навукова абгрунтаваную сістэму, выдання рознага роду зборнікаў і зводаў заканадаўства. Такая дзейнасць звычайна называецца сістэматызацыяй заканадаўства. У юрыдычнай літаратуры сістэматызацыя заканадаўства вызначаецца як дзейнасць па ўпарадкаванні і ўдасканаленні заканадаўства, прывядзенні яго ў вызначаную сістэму шляхам складання адзіных нарматыўных прававых актаў ці іх зборнікаў [1, с. 318; 5, с. 284].

Сістэматызацыя ваеннага заканадаўства як сістэмы нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць грамадскія адносіны ў вобласці забеспячэння ваеннай бяспекі дзяржавы, з'яўляецца аб'ектыўным патрабаваннем удасканалення прававой базы будаўніцтва Узброеных Сіл, іншых войск і вайсковых фарміраванняў Рэспублікі Беларусь. Таму ўяўляе вялікую цікавасць вывучэнне дзейнасці па сістэматызацыі ваеннага заканадаўства ў розныя перыяды гісторыі Беларусі.

Гісторыю ваеннага заканадаўства ў гісторыі Беларусі можна ўмоўна падзяліць на наступныя перыяды: перыяд ВКЛ (XIII–XVI стст.), перыяд Рэчы Паспалітай (1569–1795 гг.), перыяд Расійскай імперыі (1795–1917 гг.), савецкі перыяд (1917–1991 гг.), постсавецкі перыяд (з 1991 г. па цяперашні час). Вытокі ваеннага права Беларусі ўзыходзяць да звычаёвага права, якое пераважала да сярэдзіны XV ст., а затым стала выцясняцца пісаным правам, у якім звычаёвыя нормы набылі форму законаў у выглядзе грамат, прывілеяў і іншых прававых актаў.

Упершыню ў гісторыі Беларусі ваеннае права як сукупнасць прававых нормаў, якія рэгламентуюць вайсковыя праваадносіны, і адасобленая галіна права было вылучана вялікім беларускім гуманістам і асветнікам Францыскам Скарынай. У прадмове да кнігі «Другі закон» ён даў аналіз асноўных прынцыпаў права, яго паходжання, прызначэння і дзялення на галіны. Адной з галін права Ф. Скарына лічыў права «рицерское или военное, еже на войне соблюдаемо бываеть» [9, с. 65].

Пісанае ваеннае права ВКЛ пачало развівацца ў XVI ст. Першымі воінскімі законамі былі пастановы Навагрудскага (1502), Віленскага (1507), Менскага (1507) і іншых соймаў. Так, па пастанове Навагрудскага сойма 1502 г. усе князі, паны, зямяне і дваране павінны былі выстаўляць з кожных 10 сялянскіх двароў аднаго ратніка з узбраеннем, на кані з кап'ем. Аб вайсковай павіннасці простых людзей было запісана ў Віцебскай і Полацкай

граматах, якія прадпісвалі віцяблянам і палачанам заўсёды быць гатовымі несці ваенную службу [11, с. 230].

У гісторыі Беларусі кадыфікацыя нормаў ваеннага права ўпершыню была ажыццёўлена ў Статуце ВКЛ 1529 г., які вызначыў круг ваеннаабавязаных, прадугледжваў меры пакарання за невыкананне вайсковых абавязкаў і за злачынствы, здзейсненыя ваярамі, рэгламентаваў правы і абавязкі гетмана. Далейшая сістэматызацыя нормаў ваеннага права было зроблена ў Статутах 1566, 1588 гг. Раздзел II «Аб абароне земскай» Статута ВКЛ 1588 г. падрабязна рэгламентаваў пытанні ваеннага права, у прыватнасці, крымінальнай адказнасці ваяроў [10].

Першы ў ВКЛ зборнік заканадаўчых актаў па ваенным праве «Артыкулы ваенныя» быў выдадзены па загадзе віленскага ваяводы і гетмана Вялікага Княства Літоўскага Міхаіла Казіміра Радзівіла ў 1754 г. у Нясвіжы [12]. Гэта кніга была першым сістэматызаваным выданнем актаў ваеннага заканадаўства Беларусі і Літвы і ўтрымлівала пастановы соймаў і распараджэнні гетманаў XVI–XVIII стст., у якіх вызначаліся асноўныя абавязкі вайскоўцаў, парадак прыцягнення да адказнасці за дапушчаныя правапарушэнні і інш. У «Артыкулы ваенныя» былі ўключаны ваенныя (гетманскія) артыкулы, выдадзеныя ў XVII–XVIII стст.: артыкулы вайсковыя гетманскія 1609 г., артыкулы іншаземнаму войску Уладзіслава IV, салдацкія артыкулы гетмана Рыгора Хадкевіча, ваенныя артыкулы, выдадзеныя гетманам Янушам Радзівілам пад Глускам, ваенныя артыкулы гетмана Міхаіла Казіміра Паца, ваенныя артыкулы гетмана Міхаіла Казіміра Радзівіла 1746 г. Акрамя таго, некаторыя артыкулы ваенныя былі надрукаваны ў храналагічным зборы нарматыўных актаў ВКЛ і Польшчы, выдадзеным пад назваю «Volumina Legum» («Кніга законаў») у 1732–1782 гг. Артыкулы вайсковыя ў сваёй сукупнасці рэгулявалі ўсе найважнейшыя правілы паводзін як радавых ваяроў, так і каманднага складу. Па сутнасці, яны з'яўляліся першымі дысцыплінарнымі і баявымі статутамі войска, а таксама зборнікамі нормаў ваенна-крымінальнага права.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай і далучэння тэрыторыі ВКЛ да Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. класічным прыкладам кадыфікацыі ваеннага заканадаўства з'яўляецца Звод ваенных пастаноў 1838 г. (далей – Звод). Падрыхтоўка Зводу ажыццяўлялася з 1826 г. па ініцыятыве генерал-маёра Д. І. Ахшарумава ў II аддзяленні Уласнай Яго Імператарскай Вялікасці канцылярыі пад непасрэдным кіраўніцтвам М. М. Сперанскага. На працягу дзвюх з паловай гадоў, з ліпеня 1827 г. па люты 1830 г. была складзена першая частка Зводу; у 1830 г. – другая частка, а ў 1832 г. – трэцяя і чацвёртая часткі Зводу. У красавіку 1835 г. М. М. Сперанскі прадставіў імператару Мікалаю I усе кнігі Зводу. Для іх праверкі, якая працягвалася з 1834 па 1837 г., быў утвораны адмысловы Камітэт [2, с. 496–500]. Звод быў выдадзены ў 1839 г., а ўступіў у сілу з 1 студзеня 1840 г.

Звод быў падзелены на пяць частак. У частцы I «Стварэнне ваенных устаноў» былі сабраны канстытуцыйныя законы, якія вызначалі ўладкаванне ўзброеных сіл. Усе законапалажэнні, якія тычыліся арганізацыі войскаў, былі падзелены на некалькі раздзелаў у адпаведнасці з важнасцю органаў ваеннага кіравання. Кожны раздзел складаў адмысловую кнігу. У кнізе 1-й «Стварэнне Ваеннага Міністэрства і асобных усталяванняў» утрымліваліся палажэнні, якія вызначаюць арганізацыю цэнтральных органаў ваеннага кіравання; у кнізе 2-ой «Стварэнне войск з іх упраўленнямі» ўтрымоўваліся законапалажэнні пра арганізацыю асобных воінскіх часцей; у кнізе 3-й «Стварэнне ваенна-навучальных устаноў» вызначалася арганізацыя навучання ваеннаму майстэрству вайскоўцаў, галоўным чынам – афіцэраў і ўнтэр-афіцэраў; у кнізе 4-й «Стварэнне гаспадарчых устаноў з іх упраўленнямі» – арганізацыя ўстаноў, што прызначаліся для забеспячэння войскаў. Частка II Зводу «Статут аб службе па ваенным ведамстве наогул» вызначала ўзаемаадносіны вайскоўцаў паміж сабою (кніга 1-я «Аб праходжанні службы па ваенным ведамстве», кніга 2-я «Аб ўзнагародах падчас праходжання службы і пры адстаўцы»). Частка III Зводу «Наказ войскам» утрымлівала палажэнні, якія вызначалі ўнутранае жыццё войскаў як адасобленага арганізма (кніга 1-я «Пра ўнутранае кіраванне войскамі», кніга 2-я «Статут пра службу войск»). У частцы IV Зводу – «Статуце гаспадарчым» – былі сабраны палажэнні, якія рэгламентавалі гаспадарчыя адносіны ва ўзброеных сілах. Заключная, частка V Зводу «Статут ваенна-крымінальны», утрымлівала законы, якія ахоўвалі ўсталяваны парадак у войску. У 1-й кнізе «Аб злачынствах і пакараннях» утрымліваліся законы пра магчымыя выпадкі парушэння вайсковай дысцыпліны і пра пакаранне, якое чакала парушальніка; у 2-й «Аб ваенным судзе» – законы аб парадку адпраўлення правасуддзя ў войску.

У 1869 г. Звод быў перапрацаваны па новай сістэме і дзейнічаў з наступнымі зменамі да апошніх дзён існавання царскай Расіі.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пытанням сістэматызацыі ваеннага заканадаўства савецкая ўлада надавала досыць вялікую ўвагу. М. Д. Бонч-Бруевіч, які быў у той час кіраўніком Вышэйшага Ваеннага Савета, у спецыяльнай запісцы ад 27 красавіка 1918 г. дакладваў Вышэйшаму Ваеннаму Савету: «Совершенно нельзя ограничиваться напечатанием законов, приказов, штатов и табелей в официальной газете – необходимо издавать постепенно книги нового свода военного законодательства, для чего организовать специальный отдел военно-хозяйственного совета "по составлению свода военного законодательства", который должен вести работу по строго обдуманной научно-практической системе. Считаю недопустимым промедление в решении этих вопросов, так как беспорядок в законодательстве, безусловно, приводит к анархии и в жизни» [4, с. 22–23]. Аднак у сілу розных абставін Звод не быў падрыхтаваны.

У гады ваеннай рэформы 1924–1926 гг. ізноў вярнуліся да гэтай ідэі. У загадзе РВС СССР ад 26 лютага 1926 г. № 120 адзначалася: «…назрела потребность приступить к планомерной кодификации действующих по Наркомвоенмору законоположений, дабы дать армии в стройной системе нормы, регулирующие ее устройство, службу и быт» [4, с. 23]. Але стварэнне «Зводу пастаноў, якія дзейнічаюць у РККА» было ажыццёўлена толькі часткова.

З пераходам да будаўніцтва Узброеных Сіл СССР цалкам на кадравай аснове пытанне пра распрацоўку «Зводу ваенных законапалажэнняў» было паднята зноў. Быў распрацаваны праект новай схемы Зводу. Аднак працы па падрыхтоўцы Зводу перашкодзіла Вялікая Айчынная вайна. У пасляваенныя гады былі прыняты новыя агульнавайсковыя статуты, Закон аб крымінальнай адказнасці за вайсковыя злачынствы, Закон СССР «Аб усеагульным вайсковым абавязку», некаторыя палажэнні (аб матэрыяльнай адказнасці ваеннаслужачых за шкоду, прычыненую дзяржаве, аб ваенных трыбуналах) і шэраг іншых нарматыўных прававых актаў.

Абвяшчэнне 27 ліпеня 1990 г. Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, станаўленне Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы запатрабавалі стварэння нацыянальнай прававой базы дзейнасці Узброеных Сіл. За параўнальна кароткі прамежак часу быў прыняты шэраг асноўных заканадаўчых актаў у вобласці абароны, у тым ліку законы «Аб абароне», «Аб Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь» і інш.

У юрыдычнай літаратуры выказваліся розныя меркаванні з нагоды накірункаў сістэматызацыі ваеннага заканадаўства. У прыватнасці, В. Ю. Калугін, В. А. Озераў, Г. А. Рэшэтаў, В. А. Селюкоў выказвалі прапановы аб падрыхтоўцы Ваеннага кодэкса [3, с. 115; 6, с. 17; 7, с. 49; 8, с. 150–176]. На думку Г. Н. Калібабы, якая з'яўляецца актуальнай і зараз, зыходзячы з практыкі кадыфікацыі ваеннага заканадаўства, найлепшай формай мог бы з'явіцца Звод ваеннага заканадаўства, які б рэгламентаваў будаўніцтва ўзброеных сіл, дзейнасць органаў ваеннага кіравання і асабовага складу войска [4, с. 29].

Адметнаю рысаю сучаснага заканадаўства Рэспублікі Беларусь з'яўляецца імкненне да актыўнай кадыфікацыі і кансалідацыі нарматыўных прававых актаў. Варта адзначыць, што цяпер у Рэспубліцы Беларусь дзейнічае 25 кодэксаў. Канцэпцыя ўдасканалення заканадаўства Рэспублікі Беларусь, ухваленая Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 красавіка 2002 г. № 205, разглядае прыняцце Ваеннага кодэкса як завяршальны этап рэфармавання заканадаўства аб абароне. Зараз аналагу падобнага кодэкса няма ні ў воднай з краін СНД.

Стварэнню Ваеннага кодэкса павінен папярэднічаць аналіз і інвентарызацыя ўсіх актаў ваеннага заканадаўства. У сувязі з гэтым з'яўляецца мэтазгоднай падрыхтоўка Зводу ваеннага заканадаўства Рэспублікі

Беларусь (найперш у электронным выглядзе), якi б уключаў, апроч заканадаўчых, i iншыя нарматыўныя прававыя акты, у тым лiку i нарматыўныя прававыя акты дзяржаўных органаў, у якiх прадугледжана ваенная служба, а ўжо на яго аснове – распрацоўка Ваеннага кодэкса. Гэты дакумент стане асновай прававога рэгулявання грамадскiх адносiн у ваеннай сферы. Відавочна, што Ваенны кодэкс не зможа ўключыць у сябе ўсе акты ваеннага заканадаўства, паколькi iх даволi шмат (больш 1000), i колькасць такiх актаў увесь час павялiчваецца.

Канцэпцыя ўдасканалення заканадаўства Рэспублiкi Беларусь у якасцi аднаго з накiрункаў прававой iнфарматызацыi вызначае «стварэнне ў Беларусi i пастаяннае развiццё мадэлi дзяржаўнай сiстэмы прававой iнфармацыi, заснаванай на камп'ютарызацыi i аўтаматызацыi працэсаў падрыхтоўкi, прыняцця, захавання, сiстэматызацыi i распаўсюджання прававой iнфармацыi». Масiў нарматыўных, першым чынам лакальных, прававых актаў цэнтральных i iншых органаў ваеннага кiравання пастаянна павялiчваецца, i ў той жа час даведкавая праца па прававых актах на папяровых носьбiтах, якая праводзiцца галоўным чынам уручную, ужо састарэла.

Навукова абгрунтаваная сiстэматызацыя прававой iнфармацыi дазваляе нарматворчаму органу ў кароткi тэрмiн ацанiць увесь масiў дзеючых прававых актаў, больш паспяхова i з меншымi выдаткамi выявiць няўзгодненасць, супярэчнасцi, а падчас правапрымяняльнай дзейнасцi – аператыўна атрымаць дакладную прававую iнфармацыю. Таму стварэнне эфектыўнага сродку ўлiку i пошуку прававых актаў вельмi важна з пункту гледжання стварэння ўмоў для шырэйшага распаўсюджання прававой iнфармацыi, павышэння якасцi нарматворчасцi. Сучаснае развiццё iнфармацыйных тэхналогiй, стварэнне iнфармацыйна-пошукавых сiстэм абумоўлiвае актыўны працэс удасканалення пошуку прававой iнфармацыi. У сувязi з гэтым актуальна ўкараненне ў практыку даведкава-прававых сiстэм, якiя змяшчаюць прававыя акты Мiнiстэрства абароны, iншых дзяржаўных органаў, у якiх прадугледжана ваенная служба. Асаблiва гэта датычыцца выдаваемых адпаведнымi дзяржаўнымi органамi лакальных нарматыўных прававых актаў, без якiх эфектыўнае прававое рэгуляванне дзейнасцi вайсковых фармiраванняў не ўяўляецца магчымым.

У 2010 г. у Нацыянальным цэнтры прававой iнфармацыi Рэспублiкi Беларусь (далей – НЦПI) у рамках выканання навукова-даследчых i вопытна-канструктарскiх работ распрацавана тэхналогiя фармiравання i вядзення банкаў дадзеных прававой iнфармацыi ў дзяржаўных органах Рэспублiкi Беларусь. Гэтая тэхналогiя дазваляе дзяржаўным органам i iншым арганiзацыям ажыццяўляць фармiраванне, вядзенне i актуалiзацыю банкаў дадзеных прававой iнфармацыi, а таксама забяспечыць аднастайнае афармленне i адзiнства тэхналогii прадстаўлення ў НЦПI прававых актаў у электроннай форме для наступнай iх рэгiстрацыi ў Нацыянальным рэестры прававых

актаў Рэспублікі Беларусь і ўключэнні ў інфармацыйны масіў эталоннага і іншых банкаў дадзеных прававой інфармацыі, якія фарміруюцца НЦПІ. Выкарыстанне дадзенай тэхналогіі ў дзейнасці Узброеных Сіл, іншых войск і вайсковых фарміраванняў дазволіць выйсці на якасна новы ўзровень забеспячэння прававой інфармацыяй адпаведных органаў ваеннага кіравання, воінскіх часцей і арганізацый, будзе спрыяць павышэнню эфектыўнасці сістэматызацыі прававых актаў і нарматворчай дзейнасці ў ваеннай сферы.

Такім чынам, сістэматызацыя нацыянальнага ваеннага заканадаўства гістарычна абумоўлена і мае вялікае значэнне. Паспяховае вырашэнне задач сістэматызацыі ваеннага заканадаўства, укараненне сучасных інфармацыйных тэхналогій у прававую сферу будуць спрыяць павышэнню эфектыўнасці прававога рэгулявання жыцця і дзейнасці Узброеных Сіл, іншых войск і вайсковых фарміраванняў Рэспублікі Беларусь, умацаванню законнасці і правапарадку, павышэнню іх боегатоўнасці і баяздольнасці.

## Літаратура

1. *Вишневский, А. Ф.* Общая теория государства и права / А. Ф. Вишневский, Н. А. Горбаток, В. А. Кучинский; под общ. ред. А.Ф. Вишневского. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск: Тесей, 1999. – 560 с.

2. *Заусцинский, П.Ф.* История кодификации русского военного законодательства / П. Ф. Заусцинский. – Спб.: Военная типография, 1908. – 548 с.

3. *Калугин, В. Ю.* Развитие законодательства в сфере национальной безопасности и обороны / В. Ю. Калугин // Направления совершенствования и развития национального законодательства Республики Беларусь / И. С. Андреев [и др.]. – Минск, 1999. – Гл. 8. – С. 108–115.

4. *Колибаба, Г. Н.* О кодификации военного законодательства / Г. Н. Колибаба // Военная мысль. – 1966. – № 10. – С. 20–30.

5. *Лазарев, В. В.* Теория государства и права: учебник для вузов / В. В. Лазарев, С. В. Липень. – 2-е изд., испр и доп. – М.: Спарк, 2000. – 511 с.

6. *Озеров, В. А.* Конституционно-правовые основы военной реформы в Российской Федерации: автореф. дис. … канд. юрид. наук: 12.02.02 / В. А. Озеров; Российская академия государственной службы при Президенте Российской Федерации. – М., 2001. – С. 17.

7. *Решетов, Г. А.* Организационно-правовые основы деятельности юридической службы Вооруженных Сил России в XVIII – начале XX в. (историко-правовое исследование): дис. ... канд. юрид наук / Г. А. Решетов. – М., 2002. – С. 49.

8. *Селюков, В. А.* Российское военное законодательство в конце XIX – начале XX века (историко-правовое исследование): дис. … канд. юрид. наук / В. А. Селюков. – М., 1996. – С. 150–176.

9. *Скарына, Ф.* Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, пасхалія / Ф. Скарына. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – С. 65.

10. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. – Мінск: Беларусь, 2002. – 207 с.

11. *Юхо, Я. А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэбн. дапам.: у 2 ч. / Я. А. Юхо. – Мінск: РИВШ БДУ, 2000. – Ч. 1. – 352 с.

12. Artykuly woienne: Powaga Rzeczy Pospolitey, krolow polskich, y hetmanow W. X Litt: roznymi czasy ustanawione. Teraz zas z rozkazu Jasnie Oswieconego Xiazecia Jegomosti Michala V. Kazimierza Radziwilla, wojewody Wilenskiego hetmana Wielkiego W. X. Litt: przedruk. – Nieswiz: w druk. Xiazecej Radziwillowskiey in Coll. Soc. Jesu, 1754. – 250 /80/ s.